Зарегистрировано в Национальном реестре правовых актов

Республики Беларусь 12 октября 2012 г. N 8/26473

# ПАСТАНОВА МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
## 22 жніўня 2012 г. N 101

## АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ ІНСТРУКЦЫІ АБ ПАРАДКУ ПРАВЯДЗЕННЯ АТЭСТАЦЫІ ПЕДАГАГІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ (АКРАМЯ ПЕДАГАГІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ З ЛІКУ ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКАГА СКЛАДУ)

(в ред. постановлений Минобразования от 26.03.2014 N 20,
от 26.11.2014 N 163, от 20.11.2015 N 131, от 11.05.2017 N 46,
от 08.05.2018 N 37, от 01.08.2022 N 216, от 01.04.2024 N 36,
от 26.11.2025 N 196)

На падставе падпункта 4.26 пункта 4 Палажэння аб Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 4 жніўня 2011 г. N 1049, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:
(в ред. постановлений Минобразования от 01.08.2022 N 216, от 26.11.2025 N 196)

1. Зацвердзіць Інструкцыю аб парадку правядзення атэстацыі педагагічных работнікаў сістэмы адукацыі (акрамя педагагічных работнікаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу) (дадаецца).
(п. 1 в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

2. Выключаны.
(п. 2 исключен. - Постановление Минобразования от 11.05.2017 N 46)

3. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

| Міністр | С.А.Маскевіч |
|---|---|

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Брэсцкага абласнога
выканаўчага камітэта
К.А.Сумар
13.08.2012

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Віцебскага абласнога
выканаўчага камітэта
А.М.Косінец
26.07.2012

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Гомельскага абласнога
выканаўчага камітэта
У.А.Дворнік
10.08.2012

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Мінскага абласнога
выканаўчага камітэта
Б.В.Батура
26.07.2012

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Гродзенскага абласнога
выканаўчага камітэта
С.Б.Шапіра
26.07.2012

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Мінскага гарадскога
выканаўчага камітэта
М.А.Ладуцька
26.07.2012

УЗГОДНЕНА
Старшыня

УЗГОДНЕНА
Міністр працы

Магілёўскага абласнога
выканаўчага камітэта
П.М.Руднік
24.07.2012

і сацыяльнай абароны
Рэспублікі Беларусь
М.А.Шчоткіна
20.08.2012

УЗГОДНЕНА
Старшыня Цэнтральнага камітэта
Беларускага прафесійнага
саюза работнікаў
адукацыі і навукі
А.А.Бойка
20.08.2012

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
22.08.2012 N 101

# ІНСТРУКЦЫЯ
# АБ ПАРАДКУ ПРАВЯДЗЕННЯ АТЭСТАЦЫІ ПЕДАГАГІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ (АКРАМЯ ПЕДАГАГІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ З ЛІКУ ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКАГА СКЛАДУ)

(в ред. постановлений Минобразования от 26.03.2014 N 20,
от 26.11.2014 N 163, от 20.11.2015 N 131, от 11.05.2017 N 46,
от 08.05.2018 N 37, от 01.08.2022 N 216, от 01.04.2024 N 36,
от 26.11.2025 N 196)

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак правядзення атэстацыі педагагічных работнікаў сістэмы адукацыі (акрамя педагагічных работнікаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу).
(в ред. постановления Минобразования от 20.11.2015 N 131)

2. Дзеянне дадзенай Інструкцыі распаўсюджваецца на педагагічных работнікаў устаноў адукацыі, іншых арганізацый, якім у адпаведнасці з заканадаўствам дазволена ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, устаноў, якія ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі (далей, калі не ўстаноўлена іншае, - арганізацыі сістэмы адукацыі), а таксама на педагагічных работнікаў, што працуюць па працоўных або грамадзянска-прававых дагаворах у індывідуальных прадпрымальнікаў, якім у адпаведнасці з заканадаўствам дазволена ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць (далей, калі не ўстаноўлена іншае, - педагагічныя работнікі ІП), прыёмных бацькоў, бацькоў-выхавальнікаў.
(в ред. постановлений Минобразования от 01.04.2024 N 36, от 26.11.2025 N 196)

3. Атэстацыя педагагічных работнікаў праводзіцца ў мэтах вывучэння і ацэнкі іх прафесійнага ўзроўню, дзелавых і асабістых якасцей, вынікаў педагагічнай дзейнасці па фарміраванні ведаў, уменняў, навыкаў, інтэлектуальнага, маральнага, творчага і фізічнага развіцця навучэнцаў пры рэалізацыі зместу адукацыйных праграм дашкольнай, агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, спецыяльнай, дадатковай адукацыі, праграм выхавання, аказанні карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, ажыццяўленні навукова-метадычнага забеспячэння, а таксама вывучэння і ацэнкі дзейнасці бацькоў-выхавальнікаў і прыёмных бацькоў па падтрымцы дзяцей, якія маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, рэалізацыі плана абароны правоў і законных інтарэсаў дзіцяці, постінтэрнатным суправаджэнні дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі.
(часть первая п. 3 в ред. постановления Минобразования от 26.11.2025 N 196)

Асноўнымі прынцыпамі атэстацыі педагагічных работнікаў з'яўляюцца калегіяльнасць, сістэмнасць, цэласнасць экспертных ацэнак.

4. Атэстацыя педагагічных работнікаў праводзіцца на прысваенне або пацвярджэнне кваліфікацыйнай катэгорыі (далей, калі не ўстаноўлена іншае, - атэстацыя).

Атэстацыя праводзіцца на прысваенне другой, першай, вышэйшай кваліфікацыйных катэгорый, а настаўнікаў, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі і адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю (далей, калі не ўстаноўлена іншае, - настаўнікі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі), акрамя таго, - на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст".

Атэстацыя праводзіцца на пацвярджэнне другой, першай, вышэйшай кваліфікацыйных катэгорый, кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст" у выпадках, якія вызначаны ў частцы трэцяй пункта 5 дадзенай Інструкцыі.

Атэстацыя праводзіцца ў форме:

атэстацыйнай гутаркі - пры прысваенні (пацвярджэнні) другой і першай кваліфікацыйных катэгорый;

кваліфікацыйнага экзамену і атэстацыйнай гутаркі - пры прысваенні (пацвярджэнні) вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст".
(часть четвертая п. 4 введена постановлением Минобразования от 01.08.2022 N 216)
(п. 4 в ред. постановления Минобразования от 11.05.2017 N 46)

5. Атэстацыя праводзіцца па ініцыятыве педагагічнага работніка або па ініцыятыве кіраўніка арганізацыі сістэмы адукацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, якому ў адпаведнасці з заканадаўствам дазволена ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць (далей - ІП).

Па ініцыятыве педагагічнага работніка праводзіцца атэстацыя на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі.

Па ініцыятыве кіраўніка арганізацыі сістэмы адукацыі (са згоды педагагічнага савета ўстановы адукацыі (савета ўстановы адукацыі), ІП можа праводзіцца атэстацыя на пацвярджэнне кваліфікацыйнай катэгорыі ў дачыненні да педагагічнага работніка, які знізіў узровень сваёй працы і дзейнасць якога не адпавядае ўстаноўленым патрабаванням, або педагагічнага работніка, які мае перапынак у працы на пасадах педагагічных работнікаў больш за два гады. Такой атэстацыі не падлягаюць цяжарныя жанчыны і жанчыны, якія маюць дзяцей ва ўзросце да пяці гадоў, члены атэстацыйных камісій, створаных у адпаведнасці з пунктамі 14 і 15 дадзенай Інструкцыі. Атэстацыя на пацвярджэнне кваліфікацыйнай катэгорыі з'яўляецца для педагагічнага работніка абавязковай.
(в ред. постановлений Минобразования от 01.08.2022 N 216, от 01.04.2024 N 36)

Атэстацыя на пацвярджэнне кваліфікацыйнай катэгорыі не павінна праводзіцца больш за адзін раз у пяць гадоў.
(п. 5 в ред. постановления Минобразования от 11.05.2017 N 46)

6. Прысваенне кваліфікацыйных катэгорый педагагічнаму работніку па кожнай займаемай пасадзе служачага ажыццяўляецца паслядоўна, за выключэннем выпадкаў, якія прадугледжаны часткамі трэцяй - сёмай пункта 19, пунктамі 20 і 20-1 дадзенай Інструкцыі.
(часть первая п. 6 в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

Кваліфікацыйная катэгорыя прысвойваецца педагагічнаму работніку па кожнай займаемай пасадзе служачага, для якой прысваенне кваліфікацыйных катэгорый прадугледжана адпаведнай кваліфікацыйнай характарыстыкай.
(часть вторая п. 6 введена постановлением Минобразования от 11.05.2017 N 46; в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

7. Выключаны.
(п. 7 исключен. - Постановление Минобразования от 11.05.2017 N 46)

8. Кваліфікацыйная катэгорыя, якая прысвоена педагагічнаму работніку па пасадзе служачага,

перайменаванай ва ўстаноўленым парадку, захоўваецца.
(в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

9. Кваліфікацыйная катэгорыя ў выпадках і ў парадку, якія ўстаноўлены дадзенай Інструкцыяй, можа быць адменена.

10. Для правядзення атэстацыі ствараецца атэстацыйная камісія ў парадку, які ўстаноўлены дадзенай Інструкцыяй.

## ГЛАВА 2
## АТЭСТАЦЫЙНАЯ КАМІСІЯ, ЯЕ СКЛАД, ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ АТЭСТАЦЫІ

11. Атэстацыйная камісія ствараецца ў арганізацыі сістэмы адукацыі, структурных падраздзяленнях абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў, гарадскіх, раённых выканаўчых камітэтаў, мясцовых адміністрацый раёнаў у гарадах, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі (далей, калі не ўстаноўлена іншае, - аддзел (упраўленне) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа).
(п. 11 в ред. постановления Минобразования от 08.05.2018 N 37)

12. У склад атэстацыйнай камісіі не ўключаюцца педагагічныя работнікі, якія плануюць праходзіць атэстацыю у перыяд яе паўнамоцтваў.
(в ред. постановления Минобразования от 11.05.2017 N 46)

13. Тэрмін паўнамоцтваў атэстацыйнай камісіі - адзін год з даты прыняцця загаду аб вызначэнні яе складу.

14. Атэстацыйная камісія арганізацыі сістэмы адукацыі ствараецца для атэстацыі педагагічных работнікаў гэтых арганізацый, за выключэннем атэстацыі педагагічных работнікаў на прысваенне і пацвярджэнне кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст", у складзе не менш за пяць чалавек і выбіраецца на сходзе калектыву педагагічных работнікаў (акрамя педагагічных работнікаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу) шляхам тайнага галасавання (далей - галасаванне). На сходзе павінна прысутнічаць больш за палову педагагічных работнікаў арганізацыі. У атэстацыйную камісію могуць быць выбраны педагагічныя работнікі, якія маюць першую, вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю або кваліфікацыйную катэгорыю "настаўнік-метадыст". Абранымі ў атэстацыйную камісію лічацца педагагічныя работнікі, за якіх прагаласавала больш за 50 працэнтаў ад колькасці ўдзельнікаў сходу.
(часть первая п. 14 в ред. постановления Минобразования от 01.04.2024 N 36)

Перад правядзеннем выбараў педагагічных работнікаў у склад камісіі з членаў калектыву педагагічных работнікаў арганізацыі сістэмы адукацыі выбіраецца падліковая камісія ў колькасці не менш чым тры чалавекі (у складзе старшыні і членаў камісіі), якая ажыццяўляе тайнае галасаванне, падлік галасоў і афармленне пратакола падліковай камісіі з рашэннем па выніках выбрання атэстацыйнай камісіі.

У склад атэстацыйнай камісіі арганізацыі сістэмы адукацыі ўваходзіць кіраўнік гэтай арганізацыі або па яго рашэнню іншая ўпаўнаважаная ім асоба, а таксама прадстаўнік прафсаюзнага камітэта (пры яго наяўнасці), упаўнаважаны адпаведным прафсаюзным камітэтам.

Склад атэстацыйнай камісіі арганізацыі сістэмы адукацыі вызначаецца загадам яе кіраўніка і да 1 кастрычніка бягучага навучальнага года даводзіцца да ведама педагагічных работнікаў.

У рабоце атэстацыйнай камісіі могуць прымаць удзел па аднаму ўпаўнаважанаму прадстаўніку аддзела (упраўлення) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа і вышэйстаячага прафсаюзнага органа.
(часть пятая п. 14 в ред. постановления Минобразования от 08.05.2018 N 37)

Атэстацыйная камісія выбірае старшыню, намесніка старшыні, сакратара з ліку членаў камісіі.

15. Атэстацыйная камісія аддзела (упраўлення) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа ствараецца для атэстацыі настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, якія прэтэндуюць на прысваенне або павінны пацвердзіць кваліфікацыйную катэгорыю "настаўнік-метадыст", педагагічных работнікаў арганізацый сістэмы адукацыі, у якіх з-за малой колькасці педагагічных работнікаў немагчыма стварыць камісію ў колькасці, вызначанай у частцы першай пункта 14 дадзенай Інструкцыі, педагагічных работнікаў ІП, прыёмных бацькоў, бацькоў-выхавальнікаў, а таксама для разгляду спрэчных выпадкаў, якія

звязаны з атэстацыяй педагагічных работнікаў, у складзе не менш за сем чалавек.
(в ред. постановлений Минобразования от 01.04.2024 N 36, от 26.11.2025 N 196)

Педагагічныя работнікі прыватных устаноў адукацыі, іншых арганізацый, якім у адпаведнасці з заканадаўствам дазволена ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, педагагічныя работнікі ІП у выпадках, прадугледжаных часткай першай дадзенага пункта, праходзяць атэстацыю ў атэстацыйнай камісіі аддзела (упраўлення) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа па месцы дзяржаўнай рэгістрацыі або па месцы знаходжання структурнага (адасобленага) падраздзялення адпаведных прыватных устаноў адукацыі, арганізацый, якім у адпаведнасці з заканадаўствам дазволена ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць, ІП.
(часть вторая п. 15 в ред. постановления Минобразования от 26.03.2014 N 20)

У склад атэстацыйнай камісіі аддзела (упраўлення) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа ўключаюцца педагагічныя работнікі арганізацый сістэмы адукацыі, якія маюць першую, вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю або кваліфікацыйную катэгорыю "настаўнік-метадыст", упаўнаважаныя прадстаўнікі аддзела (упраўлення) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, а таксама адпаведнага камітэта прафсаюза (пры яго наяўнасці).

Склад атэстацыйнай камісіі аддзела (упраўлення) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа вызначаецца загадам кіраўніка адпаведнага аддзела (упраўлення) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа і не пазней за 1 кастрычніка бягучага навучальнага года даводзіцца да ведама зацікаўленых.

16. Пералік арганізацый сістэмы адукацыі, работнікі якіх атэстуюцца камісіяй аддзела (упраўлення) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа (далей - пералік устаноў), складаецца штогод да 1 кастрычніка па прапанове кіраўнікоў падведамных устаноў адукацыі, прыватных устаноў адукацыі, іншых арганізацый, якім у адпаведнасці з заканадаўствам дазволена ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць.

17. Педагагічны работнік, які выказаў жаданне прайсці атэстацыю на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі, падае пісьмовую заяву ў атэстацыйную камісію, якая прымае рашэнне аб допуску яго да атэстацыі (адмове ў допуску).
(в ред. постановления Минобразования от 11.05.2017 N 46)

Тэрмін прыняцця рашэння аб допуску да атэстацыі (адмове ў допуску) не павінен перавышаць адзін месяц з даты падачы заявы.
(часть вторая п. 17 введена постановлением Минобразования от 01.08.2022 N 216)

Рашэнне аб допуску ці адмове да допуску педагагічнага работніка да атэстацыі прымаецца на чарговым пасяджэнні атэстацыйнай камісіі. Дадзенае рашэнне з'яўляецца падставай да выдання загада аб правядзенні атэстацыі, змест якога ўказаны ў пункце 22 дадзенай Інструкцыі.
(часть третья п. 17 введена постановлением Минобразования от 26.03.2014 N 20)

18. Абавязковымі ўмовамі допуску педагагічнага работніка да атэстацыі на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі з'яўляюцца:

адпаведнасць атрыманай адукацыі кваліфікацыйным патрабаванням;

наяўнасць стажу працы (акрамя выпадкаў, якія прадугледжаны часткамі трэцяй - пятай і сёмай пункта 19, пунктамі 20 і 20-1 дадзенай Інструкцыі) у адпаведнасці з часткамі першай, другой і шостай пункта 19 дадзенай Інструкцыі.
(в ред. постановления Минобразования от 11.05.2017 N 46)
абзац исключен. - Постановление Минобразования от 01.08.2022 N 216.

Абавязковымі ўмовамі допуску для педагагічных работнікаў, якія прэтэндуюць на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст", акрамя пералічаных у абзацах другім і трэцім часткі першай дадзенага пункта, з'яўляецца наяўнасць аўтарскай методыкі выкладання вучэбнага прадмета або ўласнага вопыту, які абагульнены і выкарыстоўваецца іншымі настаўнікамі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, публікацый у навукова-метадычных і іншых выданнях аб вопыце прымянення сучасных адукацыйных, выхаваўчых і інфармацыйных тэхналогій, выкарыстання эфектыўных педагагічных формаў, метадаў і сродкаў навучання.
(в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

19. Прэтэндаваць на прысваенне другой і першай кваліфікацыйных катэгорый могуць педагагічныя работнікі (акрамя майстроў вытворчага навучання ўстаноў адукацыі), якія маюць стаж працы на пасадзе, па якой атэстуюцца (далей, калі не ўстаноўлена іншае, - стаж працы), два гады, вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі і кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст" - тры гады з дня прысваення папярэдняй кваліфікацыйнай катэгорыі. У гэты стаж улічваецца час працы на пасадах, якія былі перайменаваны ва ўстаноўленым парадку.
(в ред. постановлений Минобразования от 26.03.2014 N 20, от 26.11.2014 N 163)

Майстры вытворчага навучання ўстаноў адукацыі дапускаюцца да атэстацыі з улікам стажу працы, які вызначаны кваліфікацыйнымі патрабаваннямі.

Асобы, якія атрымалі дыплом аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі з адзнакай, дыплом аб вышэйшай адукацыі з адзнакай, дыплом магістра ці дыплом даследчыка, дапускаюцца да атэстацыі на прысваенне другой кваліфікацыйнай катэгорыі без уліку стажу працы на пасадзе, па якой яны праходзяць атэстацыю.
(часть третья п. 19 в ред. постановления Минобразования от 11.05.2017 N 46)

Педагагічныя работнікі, якія маюць стаж працы на пасадах прафесарска-выкладчыцкага складу не менш чым два гады, дапускаюцца да атэстацыі на прысваенне другой кваліфікацыйнай катэгорыі без уліку стажу працы на пасадзе, па якой яны праходзяць атэстацыю.
(часть четвертая п. 19 введена постановлением Минобразования от 26.03.2014 N 20; в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

Педагагічныя работнікі, якія маюць стаж працы на пасадах прафесарска-выкладчыцкага складу не менш чым чатыры гады, дапускаюцца да атэстацыі на прысваенне першай кваліфікацыйнай катэгорыі без уліку стажу працы на пасадзе, па якой яны праходзяць атэстацыю.
(часть пятая п. 19 введена постановлением Минобразования от 26.03.2014 N 20; в ред. постановлений Минобразования от 26.11.2014 N 163, от 01.08.2022 N 216)

Асобы, якія маюць вучоную ступень і (ці) вучонае званне, дапускаюцца да атэстацыі на прысваенне першай кваліфікацыйнай катэгорыі пры наяўнасці стажу працы адзін год, а вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі - адзін год з дня прысваення першай кваліфікацыйнай катэгорыі. Пры гэтым прэтэндаваць на першую кваліфікацыйную катэгорыю яны могуць без прысваення другой кваліфікацыйнай катэгорыі.
(в ред. постановления Минобразования от 11.05.2017 N 46)

Педагагічныя работнікі, якім кваліфікацыйная катэгорыя прысвоена ў замежных краінах, дапускаюцца да атэстацыі на прысваенне той жа кваліфікацыйнай катэгорыі без уліку стажу працы на пасадзе, па якой яны праходзяць атэстацыю.
(часть седьмая п. 19 введена постановлением Минобразования от 11.05.2017 N 46)

У стаж працы, які вызначаны ў частках першай, другой і чацвёртай - шостай дадзенага пункта, не ўлічваецца перыяд знаходжання педагагічнага работніка ў адпачынку па догляду за дзіцём да дасягнення ім узросту трох гадоў.
(в ред. постановлений Минобразования от 26.03.2014 N 20, от 11.05.2017 N 46)

20. Пры праходжанні атэстацыі на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі маюць права прэтэндаваць незалежна ад стажу працы ў якасці педагагічных работнікаў, які вызначаны часткай першай пункта 19 дадзенай Інструкцыі, на прысваенне той жа кваліфікацыйнай катэгорыі, якая ім была прысвоена раней, наступныя педагагічныя работнікі:

акампаніятары, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, музычнага кіраўніка, метадыста, канцэртмайстра ці педагога дадатковай адукацыі;

выкладчыкі, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, настаўніка-дэфектолага, метадыста ці майстра вытворчага навучання ўстановы адукацыі;

выхавальнікі, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, настаўніка-дэфектолага, выхавальніка дашкольнай адукацыі, педагога сацыяльнага, педагога-псіхолага, педагога-арганізатара, педагога дадатковай адукацыі, культарганізатара, метадыста ці майстра вытворчага навучання ўстановы адукацыі;

выхавальнікі-метадысты, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, настаўніка-дэфектолага, выхавальніка дашкольнай адукацыі, метадыста, педагога

сацыяльнага, педагога-псіхолага, педагога-арганізатара, педагога дадатковай адукацыі ці майстра вытворчага навучання ўстановы адукацыі;

выхавальнікі дашкольнай адукацыі, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, настаўніка-дэфектолага, выхавальніка, метадыста, выхавальніка-метадыста, кіраўніка фізічнага выхавання, музыкальнага кіраўніка, педагога сацыяльнага, педагога-псіхолага ці педагога-арганізатара;

інструктары па фізічнай культуры, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, кіраўніка фізічнага выхавання, метадыста ці педагога дадатковай адукацыі;
(в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

кіраўнікі фізічнага выхавання, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, выхавальніка дашкольнай адукацыі, метадыста, інструктара па фізічнай культуры, педагога дадатковай адукацыі ці педагога-арганізатара;

канцэртмайстры, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, метадыста, акампаніятара, музычнага кіраўніка ці педагога дадатковай адукацыі;

майстры вытворчага навучання ўстановы адукацыі, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка ці метадыста;

метадысты, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, настаўніка-дэфектолага, выхавальніка дашкольнай адукацыі, выхавальніка, выхавальніка-метадыста, педагога сацыяльнага, педагога-псіхолага, педагога-арганізатара, педагога дадатковай адукацыі, акампаніятара, культарганізатара, канцэртмайстра, кіраўніка фізічнага выхавання, музычнага кіраўніка ці майстра вытворчага навучання ўстановы адукацыі;
(в ред. постановления Минобразования от 01.04.2024 N 36)

музычныя кіраўнікі, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, выхавальніка дашкольнай адукацыі, акампаніятара, культарганізатара, канцэртмайстра, метадыста ці педагога дадатковай адукацыі;
(в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

настаўнікі, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах выкладчыка, настаўніка-дэфектолага, метадыста ці майстра вытворчага навучання ўстановы адукацыі;

настаўнікі-дэфектолагі, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка ці метадыста;

педагогі сацыяльныя, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, выхавальніка дашкольнай адукацыі, выхавальніка, культарганізатара, метадыста, педагога-псіхолага, педагога-арганізатара ці педагога дадатковай адукацыі;

педагогі-арганізатары, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, выхавальніка дашкольнай адукацыі, выхавальніка, культарганізатара, метадыста, педагога-псіхолага ці педагога сацыяльнага;

педагогі-псіхолагі, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, метадыста, педагога сацыяльнага, выхавальніка дашкольнай адукацыі ці выхавальніка;
(в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

педагогі дадатковай адукацыі, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя па пасадах настаўніка, выкладчыка, выхавальніка, выхавальніка дашкольнай адукацыі, музычнага кіраўніка, кіраўніка фізічнага выхавання, майстра вытворчага навучання ўстановы адукацыі, культарганізатара, метадыста, інструктара па фізічнай культуры, канцэртмайстра, акампаніятара, педагога-псіхолага, настаўніка-дэфектолага, педагога сацыяльнага ці педагога-арганізатара;
(в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

прыёмныя бацькі, бацькі-выхавальнікі, калі ім прысвоена адпаведная кваліфікацыйная катэгорыя на пасадах настаўніка, выкладчыка, выхавальніка, выхавальніка дашкольнай адукацыі, музычнага кіраўніка,

кіраўніка фізічнага выхавання, майстра вытворчага навучання ўстановы адукацыі, культарганізатара, метадыста, інструктара па фізічнай культуры, канцэртмайстра, акампаніятара, педагога-псіхолага, настаўніка-дэфектолага, педагога сацыяльнага ці педагога-арганізатара.
(абзац введен постановлением Минобразования от 26.11.2025 N 196)

Пры праходжанні атэстацыі ў выпадках, прадугледжаных часткай першай дадзенага пункта, педагагічныя работнікі, якія прэтэндуюць на прысваенне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, кваліфікацыйны экзамен не здаюць.
(п. 20 в ред. постановления Минобразования от 11.05.2017 N 46)

20-1. У выключным выпадку педагагічны работнік па хадайніцтве кіраўніка арганізацыі сістэмы адукацыі ці ІП або атэстацыйнай камісіі без уліку прысвоенай раней кваліфікацыйнай катэгорыі і (або) стажу працы на пасадзе служачага, па якой ён праходзіць атэстацыю, можа быць дапушчаны да атэстацыі на прысваенне:

другой кваліфікацыйнай катэгорыі са згоды кіраўніка структурнага падраздзялення гарадскога, раённага выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе, якое ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі;

першай, вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі са згоды кіраўніка структурнага падраздзялення абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, якое ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі.
(п. 20-1 в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

21. Выключаны.
(п. 21 исключен. - Постановление Минобразования от 26.03.2014 N 20)

22. Падставай для правядзення атэстацыі з'яўляецца загад кіраўніка арганізацыі сістэмы адукацыі (аддзела (упраўлення) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа) (далей, калі не ўстаноўлена іншае, - кіраўнік), якім вызначаюцца:

тэрміны правядзення атэстацыі;

спіс педагагічных работнікаў, якія дапушчаны да атэстацыі на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі, а таксама праходзяць атэстацыю на пацвяржэнне кваліфікацыйнай катэгорыі (далей, калі не ўстаноўлена іншае, - атэстуемыя);
(в ред. постановления Минобразования от 11.05.2017 N 46)

графік атэстацыі (узгадняецца з адпаведным прафсаюзным камітэтам), які прадугледжвае дату атэстацыі (этапаў атэстацыі) кожнага атэстуемага з улікам тэрмінаў правядзення кваліфікацыйнага экзамену, парадак правядзення якога ўстаноўлены главой 3 дадзенай Інструкцыі.

Загад аб правядзенні атэстацыі даводзіцца да ведама атэстуемых на працягу трох працоўных дзён з дня яго выдання.

Тэрмін правядзення атэстацыі педагагічнага работніка не павінен перавышаць трох месяцаў з даты азнаямлення атэстуемага з загадам аб правядзенні атэстацыі.
(часть третья п. 22 в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

У выпадку, калі атэстацыя праводзіцца ў форме кваліфікацыйнага экзамену і атэстацыйнай гутаркі, тэрмін правядзення атэстацыі педагагічнага работніка не павінен перавышаць чатырох месяцаў з даты выдачы педагагічнаму работніку выпіскі з пратакола пасяджэння кваліфікацыйнай камісіі (далей, калі не ўстаноўлена іншае, - выпіска з пратакола) аб здачы кваліфікацыйнага экзамену гэтым педагагічным работнікам.
(часть четвертая п. 22 в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

У тэрміны, якія вызначаны ў частках трэцяй і чацвёртай дадзенага пункта, не ўлічваюцца перыяды часовай непрацаздольнасці і працоўнага і (ці) сацыяльнага адпачынку педагагічнага работніка.
(п. 22 в ред. постановления Минобразования от 26.03.2014 N 20)

23. Арганізацыйная работа па падрыхтоўцы да атэстацыі ажыццяўляецца асобай, упаўнаважанай кіраўніком арганізацыі сістэмы адукацыі, з удзелам членаў атэстацыйнай камісіі і ўключае наступныя этапы:

вывучэнне педагагічнай дзейнасці атэстуемага;
(в ред. постановления Минобразования от 11.05.2017 N 46)

падрыхтоўку аналітычнай інфармацыі, якая змяшчае вынікі вывучэння педагагічнай дзейнасці атэстуемага, а таксама падрабязныя звесткі аб праходжанні папярэдняй атэстацыі і прынятым рашэнні;
(в ред. постановления Минобразования от 11.05.2017 N 46)

састаўленне характарыстыкі педагагічнага работніка (далей - характарыстыка), якая змяшчае ацэнку яго прафесійных, дзелавых і асабістых якасцей.

Характарыстыка ўзгадняецца з адпаведным прафсаюзным камітэтам (пры яго наяўнасці). Аналітычная інфармацыя і характарыстыка (далей - атэстацыйныя матэрыялы) падпісваюцца кіраўніком арганізацыі сістэмы адукацыі, ІП.

Атэстуемы павінен быць азнаёмлены з характарыстыкай не пазней чым за тыдзень, а ў выпадку праходжання атэстацыі ў атэстацыйнай камісіі аддзела (упраўлення) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа - не пазней чым за два тыдні да пачатку атэстацыйнай гутаркі.
(в ред. постановления Минобразования от 26.03.2014 N 20)

Атэстацыйныя матэрыялы педагагічнага работніка, які праходзіць атэстацыю ў атэстацыйнай камісіі аддзела (упраўлення) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, накіроўваюцца ў камісію не пазней чым за 10 дзён да пачатку атэстацыі.

Тэрмін падрыхтоўкі атэстацыйных матэрыялаў не павінен перавышаць двух месяцаў з даты азнаямлення педагагічнага работніка з загадам аб правядзенні атэстацыі. У выпадку, калі атэстацыя праводзіцца ў форме кваліфікацыйнага экзамену і атэстацыйнай гутаркі, тэрмін падрыхтоўкі атэстацыйных матэрыялаў не павінен перавышаць двух месяцаў з даты выдачы педагагічнаму работніку выпіскі з пратакола аб здачы кваліфікацыйнага экзамену.
(часть пятая п. 23 в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)
Часть исключена. - Постановление Минобразования от 11.05.2017 N 46.

24. Выключаны.
(п. 24 исключен. - Постановление Минобразования от 01.08.2022 N 216)

25. Выключаны.
(п. 25 исключен. - Постановление Минобразования от 11.05.2017 N 46)

26. Выключаны.
(п. 26 исключен. - Постановление Минобразования от 11.05.2017 N 46)

27. Кваліфікацыйны экзамен папярэднічае атэстацыйнай гутарцы.

28. Вынікі кваліфікацыйнага экзамену ацэньваюцца адзнакамі "здаў" або "не здаў".

29. У выпадку, калі атэстуемы па выніках кваліфікацыйнага экзамену пры праходжанні атэстацыі на прысваенне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі (кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст") атрымаў адзнаку "здаў", але атэстацыйная камісія не прыняла рашэнне аб прысваенні яму кваліфікацыйнай катэгорыі, ён мае права прайсці атэстацыю ў форме атэстацыйнай гутаркі на працягу трох гадоў з даты здачы кваліфікацыйнага экзамену.

У выпадку, калі атэстуемы па выніках кваліфікацыйнага экзамену пры праходжанні атэстацыі на прысваенне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі (кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст") атрымаў адзнаку "не здаў", далейшая яго атэстацыя не праводзіцца.

У выпадку, калі атэстуемы па выніках кваліфікацыйнага экзамену пры праходжанні атэстацыі на пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі (кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст") атрымаў адзнаку "здаў", але атэстацыйная камісія не пацвердзіла яму кваліфікацыйную катэгорыю, або атэстуемы па выніках кваліфікацыйнага экзамену пры праходжанні такой атэстацыі атрымаў адзнаку "не здаў", кваліфікацыйная катэгорыя яму зніжаецца.

30. Ад здачы кваліфікацыйнага экзамену пры праходжанні атэстацыі на прысваенне і пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі вызваляюцца:

(в ред. постановления Минобразования от 26.03.2014 N 20)

30.1. педагагічныя работнікі, якія маюць дзяржаўныя ўзнагароды Рэспублікі Беларусь (БССР), былога Саюза ССР, а таксама дзяржаў - удзельніц СНД, прысвоеныя за дасягненні ў сферы адукацыі;

30.2. педагагічныя работнікі, якія маюць вучоную ступень і (ці) вучонае званне;

30.3. педагагічныя работнікі - аўтары вучэбных выданняў (падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, вучэбна-наглядных дапаможнікаў, дапаможнікаў, практыкумаў, рабочых сшыткаў, хрэстаматый), якія афіцыйна зацверджаны або дапушчаны ва ўстаноўленым парадку Міністэрствам адукацыі к выкарыстанню ў адукацыйным працэсе;
(пп. 30.3 в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

30.4. педагагічныя работнікі, якія сталі пераможцамі абласнога (Мінскага гарадскога) этапу або пераможцамі ці лаўрэатамі заключнага этапу рэспубліканскіх, міжнародных конкурсаў прафесійнага (педагагічнага) майстэрства педагагічных работнікаў;
(пп. 30.4 в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

30.5. педагагічныя работнікі, якія за апошнія пяць гадоў падрыхтавалі пераможцаў (дыпломы I, II, III ступені, Гран-пры, першае, другое, трэцяе месца) і (або) прызёраў:

міжнародных алімпіяд, заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах сярод навучэнцаў устаноў адукацыі, якія асвойваюць змест адукацыйных праграм базавай адукацыі, сярэдняй адукацыі, спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, прафесійна-тэхнічнай адукацыі, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага) і агульнай сярэдняй адукацыі, прафесійна-тэхнічнай адукацыі з вывучэннем асобных прадметаў на павышаным узроўні, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага) і агульнай сярэдняй адукацыі, сярэдняй спецыяльнай адукацыі на падставе агульнай базавай адукацыі, а таксама рэспубліканскай алімпіяды прафесійнага майстэрства навучэнцаў, курсантаў устаноў, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі;

міжнародных конкурсаў прафесійнага майстэрства, заключнага этапу рэспубліканскіх конкурсаў прафесійнага майстэрства, міжнародных конкурсаў, фестываляў тэхнічнай і мастацкай творчасці навучэнскай моладзі;

міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў, конкурсаў, выстаў, пленэраў, іншых спаборніцтваў, тэле- і радыёпраектаў, якія праводзяцца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства, а таксама афіцыйных спартыўных спаборніцтваў, якія праводзяцца ў адпаведнасці з рэспубліканскімі каляндарнымі планамі, міжнародных спартыўных спаборніцтваў, пераможцаў міжнародных (рэспубліканскіх) фестываляў (конкурсаў) сярод выхаванцаў устаноў дашкольнай адукацыі;
(пп. 30.5 в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

30.6. педагагічныя работнікі, якім уручана пасведчанне спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў ці спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі;
(пп. 30.6 в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

30.7. педагагічныя работнікі, пад кіраўніцтвам якіх непрафесійным (аматарскім) калектывам мастацкай творчасці прысвоена (пацверджана) найменне "народны" ("узорны") або званне "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь".
(пп. 30.7 в ред. постановления Минобразования от 11.05.2017 N 46)

30-1. Ад здачы кваліфікацыйнага экзамену пры праходжанні атэстацыі на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст" вызваляюцца педагагічныя работнікі:

якія сталі пераможцамі ў намінацыях чацвёртага (заключнага) этапу рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў "Настаўнік года Рэспублікі Беларусь";

аўтары падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, якія афіцыйна зацверджаны або дапушчаны Міністэрствам адукацыі да выкарыстання ў адукацыйным працэсе.
(п. 30-1 в ред. постановления Минобразования от 01.04.2024 N 36)

31. Атэстацыйная гутарка праводзіцца ў адпаведнасці з графікам атэстацыі на пасяджэнні атэстацыйнай камісіі. Атэстацыйная камісія разглядае атэстацыйныя матэрыялы, прадстаўленыя на педагагічных работнікаў, якія праходзяць атэстацыю.

Па выніках разгляду атэстацыйных матэрыялаў па кожнаму атэстуемаму атэстацыйная камісія прымае шляхам адкрытага (тайнага) галасавання рашэнне, прадугледжанае падпунктамі 46.1 - 46.4 пункта 46 дадзенай Інструкцыі.

Пасяджэнне атэстацыйнай камісіі афармляецца пратаколам, у якім падрабязна фіксуецца змест атэстацыйнай гутаркі (у тым ліку рэкамендацыі, якія даюцца атэстуемаму). Пратакол падпісваецца старшынёй і ўсімі членамі атэстацыйнай камісіі, якія прымалі ўдзел у галасаванні.

## ГЛАВА 3
## ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ КВАЛІФІКАЦЫЙНАГА ЭКЗАМЕНУ

32. Кваліфікацыйны экзамен (далей - экзамен) праводзіцца ў мэтах незалежнай экспертнай ацэнкі навукова-тэарэтычнай і метадычнай падрыхтоўкі педагагічных работнікаў.

33. Асноўнымі задачамі экзамену з'яўляюцца:

стымуляванне росту прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў, развіццё іх творчай ініцыятывы;

авалоданне перадавым вопытам;

уключэнне ў даследчую дзейнасць;

вызначэнне ўзроўню прафесійнага майстэрства педагагічнага работніка, які дасягнуты пасля атрымання папярэдняй кваліфікацыйнай катэгорыі.

34. Экзамен пры праходжанні атэстацыі на прысваенне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі і пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі праводзіцца ў дзяржаўнай установе адукацыі "Акадэмія адукацыі", установе адукацыі "Рэспубліканскі інстытут прафесіянальнай адукацыі", дзяржаўнай установе адукацыі "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы", ўстанове адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", установе адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі", установе адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры", Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт", абласных (Мінскім гарадскім) інстытутах развіцця адукацыі.
(в ред. постановлений Минобразования от 08.05.2018 N 37, от 01.04.2024 N 36)

Экзамен пры праходжанні атэстацыі на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст" і пацвярджэнне кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст" праводзіцца ў дзяржаўнай установе адукацыі "Акадэмія адукацыі".
(в ред. постановления Минобразования от 01.04.2024 N 36)

Размеркаванне педагагічных работнікаў для здачы кваліфікацыйнага экзамену сярод устаноў адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дадаткам.
(п. 34 в ред. постановления Минобразования от 11.05.2017 N 46)

35. Метадычнае забеспячэнне экзамену, які праводзіцца пры праходжанні атэстацыі на прысваенне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі і пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ў дзяржаўнай установе адукацыі "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы", у ўстанове адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", установе адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі", установе адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры", Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт" вызначаецца гэтымі ўстановамі.
(в ред. постановлений Минобразования от 08.05.2018 N 37, от 01.04.2024 N 36)

Метадычнае забеспячэнне атэстацыі (за выключэннем атэстацыі выкладчыкаў вучэбных прадметаў прафесійнага кампаненту і майстроў вытворчага навучання ўстановы адукацыі) вызначае дзяржаўная ўстанова адукацыі "Акадэмія адукацыі" сумесна з установай адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка".

(в ред. постановлений Минобразования от 01.08.2022 N 216, от 01.04.2024 N 36)

Метадычнае забеспячэнне атэстацыі выкладчыкаў вучэбных прадметаў прафесійнага кампаненту і майстроў вытворчага навучання ўстановы адукацыі вызначае ўстанова адукацыі "Рэспубліканскі інстытут прафесіянальнай адукацыі".
(в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)
(п. 35 в ред. постановления Минобразования от 11.05.2017 N 46)

36. З праграмай і формамі экзамену педагагічны работнік мае права азнаёміцца ва ўстанове адукацыі з ліку тых, якія ўказаны ў пункце 34 дадзенай Інструкцыі, дзе ён здае экзамен (далей - установа адукацыі), а таксама на афіцыйным сайце ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт дадзенай установы і выбраць адну з формаў экзамену.
(в ред. постановлений Минобразования от 26.03.2014 N 20, от 11.05.2017 N 46)

37. Для правядзення экзамену пры праходжанні атэстацыі на прысваенне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі і пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст" і пацвярджэнне кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст" тэрмінам на адзін год ва ўстановах адукацыі, якія ўказаны ў пункце 34 дадзенай Інструкцыі, ствараюцца кваліфікацыйныя камісіі па напрамках педагагічнай дзейнасці (далей, калі не ўстаноўлена іншае, - камісіі), у склад якіх уключаюцца педагагічныя работнікі з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу ўстаноў вышэйшай адукацыі, дадатковай адукацыі дарослых, педагагічныя работнікі, якім прысвоена вышэйшая кваліфікацыйная катэгорыя (кваліфікацыйная катэгорыя "настаўнік-метадыст"). У складзе камісіі вызначаецца старшыня.
(в ред. постановлений Минобразования от 01.08.2022 N 216, от 01.04.2024 N 36)

Камісіі ствараюцца па напрамках педагагічнай дзейнасці рашэннем кіраўніка ўстановы адукацыі да 1 снежня.
(часть вторая п. 37 в ред. постановления Минобразования от 11.05.2017 N 46)
Часть исключена. - Постановление Минобразования от 11.05.2017 N 46.

38. Тэрміны правядзення экзамену вызначаюцца загадам кіраўніка ўстановы адукацыі і даводзяцца да ведама зацікаўленых.

Па кожным напрамку педагагічнай дзейнасці экзамен праводзіцца не меней аднаго разу ў квартал.
(часть вторая п. 38 введена постановлением Минобразования от 01.08.2022 N 216)

39. Да здачы экзамену дапускаюцца асобы, якія маюць накіраванне арганізацыі сістэмы адукацыі, а ў выпадках, якія прадугледжаны часткай першай пункта 15 дадзенай Інструкцыі, - аддзела (упраўлення) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа па месцы праходжання атэстацыі.

40. Для здачы экзамену ва ўстанове адукацыі з ліку педагагічных работнікаў фарміруюцца, як правіла, групы.
(в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

41. На экзамене педагагічнаму работніку выдаецца экзаменацыйны ліст са штампам установы адукацыі, у якім ён робіць запісы.

42. Па выніках экзамену на прысваенне вышэйшай катэгорыі (пацвярджэнне вышэйшай катэгорыі, прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст", пацвярджэнне кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст") педагагічнаму работніку рашэннем большасці членаў камісіі, якія прымаюць удзел у пасяджэнні, выстаўляецца адпаведная адзнака. Рашэнне камісіі лічыцца правамоцным пры наяўнасці на пасяджэнні дзвюх трэцей членаў гэтай камісіі.

43. Вынікі экзамену фіксуюцца ў экзаменацыйнай ведамасці, якая падпісваецца старшынёй кваліфікацыйнай камісіі і яе членамі. Тэрмін захоўвання экзаменацыйных ведамасцей - пяць гадоў.

44. Па выніках здачы экзамену на прысваенне вышэйшай катэгорыі (пацвярджэнне вышэйшай катэгорыі, прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст", пацвярджэнне кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст") атэстуемаму выдаецца выпіска з пратакола за подпісам кіраўніка ўстановы адукацыі. Выпіска з пратакола прадстаўляецца педагагічным работнікам у тую атэстацыйную камісію, у якой ён атэстуецца.
(в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

У выпадку, калі педагагічны работнік праходзіць атэстацыю ў адпаведнасці з часткай першай пункта 29 дадзенай Інструкцыі ў іншага наймальніка, выпіска з пратакола па жаданню педагагічнага работніка накіроўваецца ў атэстацыйную камісію той арганізацыі сістэмы адукацыі (аддзела (упраўлення) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа), дзе ён праходзіць атэстацыю, па яе запыту. У арганізацыі сістэмы адукацыі (аддзеле (упраўленні) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа), якая накіроўвае выпіску з пратакола, захоўваецца яе копія, якая завяраецца гэтай арганізацыяй (аддзелам (упраўленнем) адукацыі).

45. На перыяд паўнамоцтваў кваліфікацыйных камісій па напрамках педагагічнай дзейнасці ва ўстанове адукацыі рашэннем яе кіраўніка ствараецца апеляцыйная камісія. У склад апеляцыйнай камісіі не ўключаюцца члены кваліфікацыйных камісій.

Пры нязгодзе педагагічнага работніка з адзнакай па выніках экзамену ён мае права звярнуцца ў апеляцыйную камісію ў дзень здачы экзамену. Апеляцыя разглядаецца камісіяй у дзень звароту атэстуемага.

Рашэнне апеляцыйнай камісіі аб'яўляецца педагагічнаму работніку ў пісьмовай форме не пазней чым праз пяць дзён пасля яго звароту.

## ГЛАВА 4
## РАШЭННІ, ЯКІЯ ПРЫМАЮЦЦА ПА ВЫНІКАХ АТЭСТАЦЫІ

46. На падставе вынікаў атэстацыйнай гутаркі атэстацыйная камісія вырашае:

46.1. прысвоіць (адмовіць у прысваенні) адпаведную кваліфікацыйную катэгорыю (з назвай пасады педагагічнага работніка, па якой ён атэстуецца);

46.2. пацвердзіць кваліфікацыйную катэгорыю (з назвай пасады педагагічнага работніка, па якой ён атэстуецца);

46.3. знізіць кваліфікацыйную катэгорыю, якая была прысвоена раней (з назвай пасады педагагічнага работніка, па якой ён атэстуецца);

46.4. адмяніць кваліфікацыйную катэгорыю (з назвай пасады педагагічнага работніка, па якой ён атэстуецца).

47. Пры прыняцці рашэння аб адмене педагагічнаму работніку другой кваліфікацыйнай катэгорыі, па якой ён праходзіць атэстацыю на пацвярджэнне, дадзеная кваліфікацыйная катэгорыя адмяняецца.

Пры прыняцці рашэння аб зніжэнні педагагічнаму работніку першай (вышэйшай) кваліфікацыйнай катэгорыі ці кваліфікацыйнай катэгорыі "настаўнік-метадыст", па якой ён праходзіць атэстацыю на пацвярджэнне, за ім захоўваецца адпаведна другая (першая) ці вышэйшая кваліфікацыйная катэгорыя.
(п. 47 в ред. постановления Минобразования от 26.03.2014 N 20)

48. Калі пры правядзенні атэстацыі на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі атэстацыйнай камісіяй устаноўлена парушэнне патрабаванняў заканадаўства пры прысваенні педагагічнаму работніку папярэдняй кваліфікацыйнай катэгорыі, яна прымае рашэнне адмовіць у прысваенні кваліфікацыйнай катэгорыі, на якую прэтэндуе педагагічны работнік. Пры наяўнасці падставы для захавання ў яго кваліфікацыйнай катэгорыі, якую ён мае, са згоды педагагічнага работніка атэстацыйная камісія прымае рашэнне аб яе пацвярджэнні, а пры адсутнасці падставы для захавання ў педагагічнага работніка гэтай кваліфікацыйнай катэгорыі або адказе яго на яе пацвярджэнне - рашэнне аб адмене гэтай кваліфікацыйнай катэгорыі.

49. Калі пры правядзенні атэстацыі на пацвярджэнне кваліфікацыйнай катэгорыі атэстацыйнай камісіяй устаноўлена парушэнне патрабаванняў заканадаўства пры прысваенні педагагічнаму работніку гэтай кваліфікацыйнай катэгорыі, то пры наяўнасці падставы для прысваення педагагічнаму работніку дадзенай кваліфікацыйнай катэгорыі камісія прымае рашэнне аб яе пацвярджэнні, а пры адсутнасці падставы для прысваення гэтай кваліфікацыйнай катэгорыі - рашэнне аб яе адмене.

Калі педагагічны работнік адмовіўся ад праходжання атэстацыі на пацвярджэнне кваліфікацыйнай катэгорыі або не з'явіўся на кваліфікацыйны экзамен або атэстацыйную гутарку без уважлівых прычын, рашэннем атэстацыйнай камісіі дадзеная катэгорыя зніжаецца (адмяняецца).
(часть вторая п. 49 введена постановлением Минобразования от 26.03.2014 N 20; в ред. постановления

Минобразования от 11.05.2017 N 46)

50. Рашэнне атэстацыйнай камісіі лічыцца правамоцным, калі за яго прагаласавала больш за 50 працэнтаў ад колькасці ўдзельнікаў галасавання і пры наяўнасці на пасяджэнні дзвюх трэцей членаў гэтай камісіі. Пры роўнай колькасці галасоў рашэнне лічыцца прынятым на карысць атэстуемага.
(в ред. постановления Минобразования от 01.04.2024 N 36)

Вынікі атэстацыі аб'яўляюцца работніку пасля галасавання.
(часть вторая п. 50 в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

51. Рашэнне атэстацыйнай камісіі арганізацыі сістэмы адукацыі ў 5-дзённы тэрмін афармляецца загадам кіраўніка арганізацыі сістэмы адукацыі, а ў выпадках, якія прадугледжаны часткай першай пункта 15 дадзенай Інструкцыі, - аддзела (упраўлення) адукацыі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа і ўступае ў сілу з дня падпісання загада.
(в ред. постановления Минобразования от 11.05.2017 N 46)

52. У выпадку, калі па выніках атэстацыі прынята рашэнне аб адмове ў прысваенні кваліфікацыйнай катэгорыі, зніжэнні або яе адмене, а таксама ў выпадку, які прадугледжаны часткай другой пункта 29 дадзенай Інструкцыі, педагагічны работнік мае права прайсці атэстацыю на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі не раней чым праз адзін год пасля прыняцця адпаведнага рашэння атэстацыйнай камісіяй.

53. Атэстацыйныя матэрыялы, заява, пратаколы пасяджэння атэстацыйнай камісіі захоўваюцца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства.
(п. 53 в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

54. Пры парушэнні парадку правядзення атэстацыі атэстацыйнай камісіяй арганізацыі сістэмы адукацыі педагагічны работнік у дзесяцідзённы тэрмін з дня азнаямлення з рашэннем атэстацыйнай камісіі мае права звярнуцца з заявай у атэстацыйную камісію структурнага падраздзялення гарадскога, раённага выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе, якое ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі, а пры парушэнні, дапушчаным атэстацыйнай камісіяй структурнага падраздзялення гарадскога, раённага выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе, якое ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі, - у атэстацыйную камісію структурнага падраздзялення абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, якое ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі.

Пры выяўленні парушэнняў парадку атэстацыі атэстацыйная камісія, у якую паступіла заява педагагічнага работніка, мае права адмяніць рашэнне атэстацыйнай камісіі арганізацыі сістэмы адукацыі (структурнага падраздзялення гарадскога, раённага выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе, якое ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі) і ў месячны тэрмін з дня звароту правесці паўторную атэстацыю педагагічнага работніка, у дачыненні да якога былі дапушчаны парушэнні.

У выпадку, калі парушэнні парадку атэстацыі былі дапушчаны ў дачыненні да педагагічнага работніка, які атэстуецца ў атэстацыйнай камісіі структурнага падраздзялення абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, якое ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі, па звароце педагагічнага работніка для яго паўторнай атэстацыі ствараецца іншая атэстацыйная камісія структурнага падраздзялення абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта, якое ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі. У склад дадзенай камісіі не могуць быць уключаны асобы, якія прымалі рашэнне ў дачыненні да гэтага педагагічнага работніка пры папярэдняй атэстацыі.

Рашэнне атэстацыйнай камісіі, якое прынята ў выпадках, прадугледжаных часткамі другой і трэцяй дадзенага пункта, лічыцца канчатковым.
(п. 54 в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216)

55. Исключен. - Постановление Минобразования от 01.08.2022 N 216.

Дадатак
да Інструкцыі аб парадку

правядзення атэстацыі педагагічных
работнікаў сістэмы адукацыі
(акрамя педагагічных работнікаў з ліку
прафесарска-выкладчыцкага складу)

## РАЗМЕРКАВАННЕ ПЕДАГАГІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ ДЛЯ ЗДАЧЫ КВАЛІФІКАЦЫЙНАГА ЭКЗАМЕНУ СЯРОД УСТАНОЎ АДУКАЦЫІ

(введено постановлением Минобразования от 11.05.2017 N 46;
в ред. постановлений Минобразования от 08.05.2018 N 37,
от 01.08.2022 N 216, от 01.04.2024 N 36)

| N п/п | Назва ўстановы | Педагагічныя работнікі, якія здаюць кваліфікацыйны экзамен |
|---|---|---|
| 1 | Абласныя (Мінскі гарадскі) інстытуты развіцця адукацыі | Педагагічныя работнікі арганізацый сістэмы адукацыі, педагагічныя работнікі ІП, за выключэннем педагагічных работнікаў, вызначаных у пунктах 3 - 8 дадзенага дадатку, і метадыстаў |
| 2 | Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Акадэмія адукацыі" | Педагагічныя работнікі арганізацый сістэмы адукацыі, у тым ліку метадысты абласных (Мінскага гарадскога) інстытутаў развіцця адукацыі, дзяржаўнай установы адукацыі "Акадэмія адукацыі", устаноў, якія ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі, педагагічныя работнікі ІП, за выключэннем педагагічных работнікаў, вызначаных у пунктах 3 - 8 дадзенага дадатку |
| (п. 2 в ред. постановления Минобразования от 01.04.2024 N 36) | | |
| 3 | Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт" | Педагагічныя работнікі ўстаноў адукацыі і іншых арганізацый сістэмы аховы здароўя |
| (в ред. постановления Минобразования от 01.04.2024 N 36) | | |
| 4 | Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" | Педагагічныя работнікі ўстаноў адукацыі ў сферы культуры, за выключэннем педагагічных работнікаў, якія рэалізуюць змест адукацыйных праграм па вучэбных прадметах агульнаадукацыйнага кампанента |
| (в ред. постановлений Минобразования от 08.05.2018 N 37, от 01.08.2022 N 216) | | |
| 5 | Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы" | Педагагічныя работнікі ўстаноў вышэйшай адукацыі, іншых арганізацый, якія рэалізуюць змест адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых |
| 6 | Установа адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі" | Педагагічныя работнікі ўстаноў адукацыі ў сферы культуры, гімназій-каледжаў мастацтваў, за выключэннем педагагічных работнікаў, якія рэалізуюць змест адукацыйных праграм па вучэбных прадметах агульнаадукацыйнага кампанента |
| (в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216) | | |
| 7 | Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры" | Кіраўнікі фізічнага выхавання, інструктары па фізічнай культуры, настаўнікі і выкладчыкі вучэбнага прадмета "Фізічная культура і здароўе", педагогі дадатковай адукацыі, якія рэалізуюць змест адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі (па турысцка-краязнаўчых, спартыўна-тэхнічных, фізкультурна-спартыўных профілях) |

| | | |
|---|---|---|
| (в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216) | | |
| 8 | Установа адукацыі "Рэспубліканскі інстытут прафесіянальнай адукацыі" | Педагагічныя работнікі ўстаноў адукацыі сістэмы прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, сістэмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, за выключэннем педагагічных работнікаў, якія рэалізуюць змест адукацыйных праграм па вучэбных прадметах агульнаадукацыйнага кампанента, педагагічныя работнікі арганізацый сістэмы адукацыі, якія рэалізуюць змест адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых |
| (в ред. постановления Минобразования от 01.08.2022 N 216) | | |